

## СА СВЯТАМ КАМСАМОЛЬСКІМ, ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ!

50 ЛКСМБ

Пятрусь БРОЎКА

# З юначых дзён

Ішлі мы з вёсак,
з плошчаў, з вуліц,
Зваў нашых сэрцаў
аганёк
На зрэбных сітцавых
кашулях
Крылаты кімаўскі значок.
На мужны заклік
камсамола
Рабочых дзеці і сялян—
Мы браліся за серп
і молат,
І за вінтоўку і наган.
Нас.на здабычу заклікалі
І хлеб, і вугаль, і руда,
І, быццам птушкі,
вылятаці
Мы з бальшавіцкага
гнязда.
Сяброўкам у світках
і скуранках
Хавалі вернасць і любоў,
А іх хусцінкі, што заранкі,
Аж прырасталі да сцягоў.
За ўсё мы браліся ўпарта,
На ўсё знаходзілі мы
спрыт—
Сядзелі ў шынялях
за партай,
Навукі грызучы граніт.
І хоць прайшло гадоў
нямала,
Але ж паміж сівых галоў
Па камсамольскаму
запалу
Я пазнаю сваіх сяброў.


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 26 (783) • Чацвер, 24 верасня 1970 г. • Цана 2 кап. • Год выдання XXIII


## У РАДЫ ПАРТЫІ

«У знамянальныя дні юбілею Ленінскага камсамола Беларусі і напярэдадні важнай палітычнай падзеі у жыцці нашай краіны—XXIV з'езда КПСС хачу звязаць свой лес з Камуністычнай партыяй, знаходзіцца у авангардзе барацьбітоу за пабудову камуністычнага грамадства», — такі змест заяу, якія паступілі у пярвічную партарганізацыю факультэта журналістыкі.

На партыйным сходзе былі разгледжаны заявы кандыдатау у члены КПСС Аляксандра Міхальчанкі, Наталлі Сінкевіч і Мікалая Ініна. На факультэце гэтыя студэнты вылучаюцца сстараннем у вучобе, чуласцю і прынцыповасцю у адносінах да таварышау, актыуным удзелам у грамадскай і камсамольскай рабоце. Рэкамендавалі прыняць іх у рады партыі камітэт камсамола універсітэта і старэйшыя выкладчыкі камуністы журфака: загадчык кафедры радыё і тэлебачання дацэнт М. Е. Дастанка, намеснік дэкана М. І. Сілуянау і іншыя.

Асобная гутарка праводзіцца з кожным уступаючым у партыю. Сакратар партбюро дакультэта тав. Дастанка зачытвае заяву Наталлі Сінкевіч. А потым, хвалюючыся, дзяучына расказвае біяграфію: калі нарадзілася, хто бацькі, як вучылася у школе, дзе працавала. Некалькі пытанняу задаюць камуністы: як вучыцца цяпер, якія нясе грамадскія нагрузкі? Дзяучыне ёсць што адказаць. Вучыцца добра, з'яуляецца членам камітэта камсамола факультэта. Але гаворыць яна сціпла, немнагаслоуна. І калі ставіцца пытанне, хто за тое, каб Наталлю Сінкевіч прыняць у рады КПСС, усе аднадушна падымаюць рукі.

Аднагалосна былі прыняты на сходзе у члены Камуністычнай партыі Аляксандр Міхальчанка, і Мікалай Інін.

**П. ЛЯОНАУ.**

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗА МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

За актыўны ўдзел у сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве, за вялікую работу па выхаванню моладзі ў духу адданасці запаветам У. І. Леніна і ў сувязі з 50-годдзем ЛКСМ Беларусі ўзнагародзіць Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі ордэнам Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ПАДГОРНЫ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

Масква, Крэмль, 23 верасня 1970 г.



Ідзе перадсвяточнае пасяджэнне бюро універсітэцкага камітэта камсамола. Адно з галоуных пытанняу у яго павесткі — рэкамендацыя лепшых камсамольцау для уступлення у рады ленінскай Камуністычнай партыі.
На здымку: рашэнне прынята аднагалосна. Сакратар камітэта камсамола хімфака Анатоль Волкау дастоіны быць членам КПСС.

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

## З КАМСАМОЛЬСКІМ ЗАПАЛАМ

З раніцы неба хмарылася. Волкі асенні туман апау на сядзібы, сады, схавау бульбянішча. Здавалася, вось-вось пойдзе дождж. Можа таму Коля Барбук — галоуны і нязменны повар першай групы другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры—не асабліва спяшаууся: нашто спешка, калі, відаць, дождж не дасць выйсці у поле. Але уся група роуна а палове дзевятай сядзела за доугім сталом (усіх жа 25 чалавек!) і цярпліва паглядала на пліту, дзе датушчвалася капуста, даварвалася бульба, дапякаліся дранікі. Спазняцца увогуле не прывыклі, а сёння не хацелася тым больш: камсамольскі ж нядзельнік!

Поле — поаач з вескай Хатляны. Адзін участак — ажно семнаццаць гектарау! — ужо дапамаглі саугасу «Дружба», што на Уздзеншчыне, вызваліць ад бульбы. Вунь яна, адборная, крухмальная, ляжыць у доугіх цёплых буртах. Кожны дзень перавыконвалі норму. А трэба было не толькі пасля капалкі клубні падбіраць, але і пасля плуга скібы разварочваць.

Што, цікава, сёння брыгадзір рабіць загадае? Аказваецца, падбіраць бульбу за баранай. Некаторыя з дзяучат крывяцца: што гэта за работа? Хай бы лепш вучні, якія таксама саугасу дапамагаюць, гэтым займаліся. Але загад ёсць загад. Ланцужком, як салдаты у атаку, ідуць дзяучаты па полі. Туман пачау паднімацца, пасвятлела. Паступова напауняюцца кошыкі. Адзін, другі, дзесяты... Уперадзе — «баявая чацвёрка»: Галя Агалакава, Валя Шашкова, Аня Грабовік, Люда Далідовіч. Ад іх стараюцца не адстаць і іншыя. Хлопцы— Сямён Апалонік, Валодзя Ваучок і Валодзя Бродскі — ледзь упрауляюцца поуныя скрыні адвозіць.

У поудзень — кароткі абедзенны перапынак. Невялікі адпачынак. Камсорг Валя Башак выкарыстоувае і яго: рыхтуецца прачытаць у мясцовай школе лекцыю пра 50-гадовы шлях беларускага камсамола. Стараста ж, Галя Гумен, задаволена адзначае у сваім уласным «працоуным журнале»: на нядзельніку прысутнічаюць усе.

Пасля абеду — змена пазіцый. Трактар разагнау новыя рады бульбы на іншым участку. Тут можна лепш праявіць сябе! Насыпаюцца кашы, папауняюцца скрыні, расце бурт. Неба ачысцілася ад хмар, распагодзілася. Ліля Аугусціновіч выпростваецца, адводзіць ад вачэй серабрыстую павуціну — выразную прыкмету «бабінага лета», задаволена усміхаецца. Працуецца на славу, з камсамольскім запалам! Сапрауднае свята камсамольскай працы!

У гэты ж дзень у вёсках Валяр'яны, Любчы, Валкі выйшлі на камсамольскі нядзельнік тры іншыя групы другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Камсамольцы працавалі самааддана, усе групы перавыканалі дзённыя заданні.

**В. КАЧАНОВІЧ.**

# НАШ КАМСАМОЛЬСКІ КЛІЧ: ЯК ЗАВЯШЧАЎ ІЛЬІЧ

## ТЭМУ ПАДКАЗАЛА ЖЫЦЦЁ

*Прафесара кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў Анатолія Яфімавіча Журава знаюць ва універсітэце не толькі як выдатнага лектара, нястомнага прапагандыста, але і як аўтара шматлікіх прац па гісторыі Ленінскага камсамола.*

*Анатоля Яфімавіча мы папрасілі расказаць аб тым, якое месца займае камсамол у яго грамадскай і творчай працы.*

— Мяркуйце самі. Толькі што вярнуўся з Ленінграда, дзе выступаў у Таўрычаскім палацы перад прапагандыстамі Ленінградскай вобласці з лекцыяй аб III з'ездзе камсамола. Сярод прысутных аказалася пяць удзельнікаў гістарычнага з'езда. Гутарка з імі была цікавай і прыемнай. Яны добра адазваліся аб лекцыі, а гэта дарагая адзнака.

У апошнія два гады па заданню ЦК ВЛКСМ з лекцыямі аб У. І. Леніне і моладзі выступаў у Прымор'і, Уладзівастоку, Ужгарадзе, Баку, Ташкенце, пабываў у Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі і іншых гарадах і краінах.

У выдавецтве «Народная асвета» выпусціў кнігу «Ленін — моладзі», а у Маскоўскім выдавецтве «Знание»—брашуру «Выконваючы запаветы Леніна».

Сярод 60 маіх прац прыкладна 40 прысвечана камсамолу, у тым ліку чатыры манаграфіі. Цяпер выходзіць у другім выданні кніга «У баях народжаны».

Як прыйшоў да гэтай тэмы? Пасля ранення ў час Вялікай Айчыннай вайны мне давялося працаваць у Краснаярскім краі. Быў камсоргам на будаўніцтве Краснаярскай райТЭЦ, пасля узначальваў аддзел прапаганды і агітацыі Краснаярскага крайкома. Ужо гэты перыяд даў мне добрае веданне практыкі камсамольскай работы. А гісторыяй камсамола Беларусі пачаў займацца з 1948 года, калі загадваў кафедрай марксізма-ленінізма Аршанскага настаўніцкага інстытута. Кандыдацкая дысертацыя мая была прысвечана дзейнасці камсамола Беларусі ў 1943—1945 гг. Абараняў яе у Ленінградзе.

Больш дэталёвае заёмства з матэрыяламі па гісторыі беларускага камсамола паказала, што пачатковы перыяд яго дзейнасці вельмі слаба распрацаван. Таму тэма доктарскай вызначылася сама па сабе: «Дзейнасць Кампартыі Беларусі па стварэнню і кіраўніцтву камсамолам». Абарона адбылася ў 1967 годзе.

Маладзёжная тэматыка мяне вельмі цікавіць і цяпер. Часта выступаю з дакладамі і лекцыямі, узначальваю камісію па прапагандзе ведаў сярод моладзі таварыства «Веды» БССР, кірую рэспубліканскім семінарам прапагандыстаў.



Перадюбілейныя дні пяцікурснікі Барыс Сінякоў і Ларыса Валожына правялі ў эксперыментальных даследаваннях на кафедры аналітычнай хіміі.

Фота Д. Чаховіча.

## СЯБЕ...

студэнтаў 4-га курса аддзялення фізікі (сакратар бюро А. Ермалаеў). студэнтаў 4-га курса радыёфізікі (сакратар П. Юрчанка). Абсалютная большасць камсамольцаў адчула сапраўдны ленінскі рытм камсамоліі, паявілася жаданне лепш працаваць і упэўненасць у сілах калектыву.

Цяпер, калі усё гэта зроблена, мы можам пераканана сцвярджаць, што затрачаныя намаганні аказаліся эфектыўнымі. Як хацелася б поспех гэтага года замацаваць і захаваць Ленінскі залік у арсенале нашай выхаваўчай работы!

У дзень 50-годдзя Ленінскага камсамола Беларусі, гаворачы аб камсамольскай рабоце, нельга не упамянуць людзей, чыёй працай яна славіцца. Які ён, радавы камсамолец 70-х гадоў?

Сціплым і ціхім хлопцам прыйшоў на факультэт Віктар Гайсёнак. Тры гады вучыўся на выдатна. Быў сакратаром камсамольскага бюро патока. На 2-м курсе едзе на цаліну. На рабоце выдзяляецца вялікай працавітасцю і вяртаецца лепшым байцом атрада. Поспехі не ускружылі яму галаву. Віктар многа працуе у камітэце камсамола факультэта. Будаўнічы атрад «Аэліта», дзе ён быў камісарам, заняў другое месца у раёне. Прынцыповасць, бескарыснасць і чуласць выдатна спалучаюцца у гэтым чалавеку.

«З такімі, як Віктар, можна пераадолець любыя цяжкасці», — гавораць старшакурснікі, якія працавалі разам з ім.

На факультэце вырасла вялікая група камсамольскіх арганізатараў, якія не уяўляюць, так, як і Віктар, жыцця без грамадскай работы. Гэта П. Кухарчык, В. Емяльяненкаў, В. Чудоўскі, Г. Баранаў, А. Мінько, Г. Пучкоў, Н. Варабей, І. Сярэнка, Е. Путан, П. Рудніцкі, Б. Хусід, Т. Фёдарава, Л. Шэхтман, А. Шанькоў, Н. Баркоўскі і многія іншыя.

Хочацца павіншаваць іх з камсамольскім святам і пажадаць поспехаў і натхнення у вучобе і камсамольскай рабоце.

**П. САЛАЎ,**
**старшы выкладчык кафедры ЭММ.**

## МАЦНЕЛІ Ў ПАЛЁЦЕ

вецкія работнікі з дакладамі аб палітыцы партыі у вёсцы. Было нямала прыкладаў добрасумленнай работы студэнцтва на месцах.

Бывалі выпадкі, калі асобныя камсамольцы адзываліся з уліку і накіроўваліся на камсамольскую работу у вёску. Так быў адазваны і пасланы сакратаром пагранічнага валкома камсамола наш актыўны таварыш Рыгор Лапіцкі.

З гадамі мацнеў універсітэцкі калектыў. Новыя атрады камсамольцаў папаўнялі армію студэнцтва і камсамольскую ячэйку. Клопаты аб кожным камсамольцу былі паўсядзённымі. Бывала, збяруцца камсамольцы факультэта і павядуць адкрытую сяброўскую размову аб тых, хто адлыньвае ад вучобы, праяўляе абыякавасць да спраў ячэйкі, пранікнут духам самалюбства. Называлі такія гутаркі камсамольцы «банямі». І неяк падцягваліся усе, больш крытычнымі і патрабавальнымі былі да сябе.

Культурных сіл у камсамольскай арганізацыі раёна было недастаткова, але Кастрычніцкі райком ЛКСМБ заўсёды ведаў, што сярод камсамольцаў БДУ знойдуцца здольныя прапагандысты для гурткоў рабочай моладзі. Часта нашых камсамольцаў накіроўвалі тэхнічнымі сакратарамі у вытворчыя камсамольскія ячэйкі. Сучасны камсамолец усміхнецца — што тут такога! А тэхнічныя сакратары паўсядзённа дапамагалі у рабоце, і іх вельмі паважалі. Не раз даводзілася слухаць на бюро райкома водгукі прадстаўнікоў рабочых ячэек пра такіх таварышаў, калі яны атрымлівалі камсамольскую рэкамендацыю для уступлення у рады партыі.

Добрай традыцыяй, якую хацелася б захаваць і памножыць, быў збор матэрыялаў, успамінаў, фота па гісторыі сваёй ячэйкі. Адзначалася дата нараджэння ячэйкі. Захавалася прывітанне ЦК ЛКСМБ да 5-годдзя з дня заснавання ячэйкі ЛКСМБ універсітэта. Віншуючы ячэйку, ЦК пажадаў максімуму акадэмічнай паспяховасці для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва. ЦК заклікаў быць бліжэй да рабочых ячэек, быць бліжэй да пралетарскага студэнцтва.

Усім савецкім людзям запомніўся дзень 22 студзеня 1924 года. У актавай зале універсітэта тады ішло пасяджэнне навуковага таварыства, прысвечанае 9 студзеня 1905 года. Старшынстваваў У. І. Пічэта. Як заўсёды, на пасяджэннях таварыства прысутнічала многа камсамольцаў. Раптам прынеслі страшную вестку, што 21 студзеня у 6 гадзін 50 мінут не стала дарагога усім Уладзіміра Ільіча. Усхваляваны рэктар гаварыў аб ролі Леніна як выдатнага мысліцеля, вучонага. У той час не было шырокай сеткі радыёкропак, і жалобную вестку разнеслі ганцы ва усе студэнцкія інтэрнаты. Збіраліся мітынгі, сходы. На адным з іх выступіў з усхваляваным расказам аб Ільічу член праўлення універсітэта прафесар М. Б. Кроль, які у 1923 годзе удзельнічаў у лячэнні Уладзіміра Ільіча і паўсядзённа з ім сустракаўся.

На усіх сходах студэнты і прафесары выказвалі сваё гарачае жаданне, каб нашаму універсітэту было прысвоена імя У. І. Леніна.

Прайшлі гады. Змяніліся пакаленні выпускнікоў. Звыш 20 год універсітэт носіць імя Леніна. Да многага абавязвае званне студэнта універсітэта імя У. І. Леніна.

**С. АШЫРОВІЧ,**
**сакратар ячэйкі КСМ БДУ.**




НА ЗДЫМКУ: састаў бюро ячэйкі КСМ і студэнцкі актыў універсітэта 1926 года.

# І ЦЯЖКАСЦІ АДСТУПАЛІ...

**Трыццаць камсамольцау і тры камуністы. Дваццаць шэсць бадзёрых і жыццярадасных юнакоу і сем дзяучат — усе студэнты БДУ. Усе трыццаць тры — байцы студэнцкага будаунічага атрада «Вікторыя», удзельнікі працоунага семестра юбілейнага года. Палова з іх ужо — старыя цалiннікі.**

**Яшчэ да ад'езду на гасцінную казахстанскую землю віктарыянцы прынялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы на працоуны семестр у гонар 50-годдзя Казахстана, Камуністычнай партыі Казахстана і 50-годдзя камсамола Беларусі.**

**Нягледзячы на штодзённыя раннія пад'ёмы і пыльныя дарогі, нягледзячы на недахоп прэснай вады і будаунічых матэрыялау, «Вікторыя» цвёрда ішла да намечанай мэты. Калі было асабліва цяжка, дапамагалі парадай і цёплым словам «старыя» — Пеця Вакульчык, Саша Кароль. На дапамогу прыходзіу з песняй або жартам навічок Саша Пазняк. І цяжкасці уступалі дарогу трыццаці тром загарэлым байцам. На вачах раслі сцены двухкватэрных жылых дамоу у пасёлку Феафанава, там жа вырас клуб. Пасёлек В.-Валошна закрасавауся адрамантаванай школай на 580 месц і нітэрнатам на 60 месц. У тэрмін адрамантаванае зернясховішча прыняло першыя тоны залатой пшаніцы. Побач са старымі мазанкамі. падняуся кармаблок, пабудаваны з саману. Рады новага саману лажыліся уздоуж канала на сотні метрау.**

**Так, цяжкасці камсамольцау не палохаюць. Сярэдні бал паспяховасці у атрадзе за мінулы навучальны год — 4,3. Прынятыя сацабавязацельствы на працоуны семестр перавыкананы. Замест 80 тысяч рублёу па плану атрадам асвоена 226 тысяч 800 рублёу капіталаукладанняу. Атрадны піянерскі лагер «Спадарожнік» у Чапаеускім раёне Уральскай вобласці заняу першае месца. Атрад «Вікторыя» заваявау агульнае другое месца сярод СБА раёна.**

**Байцы «Вікторыі» арганізавалі нядзельнік і пераявялі у фонд ВФДМ свету 165 руб., адрамантавалі помнік ахвярам белага тэрору у п. В.-Валошна, прывялі у парадак сквер.**

**Агітбрыгада была жаданай госцяй у клубах раёна. Нашы студэнты-будаунікі прачыталі дзесяткі лекцый, вялі актыуную агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод мясцовага насельніцтва. Спартыуныя мерапрыемствы планаваліся і праводзіліся разам з мясцовай моладдзю і, як правіла, заусёды збіралі многа балельшчыкау.**

**Добрую славу пакінула «Вікторыя» на зямлі цалiннай. Гэта і ёсць падарунак паувекавому юбілею беларускай камсамоліі.**

**«Да сустрэчы. Яшчэ раз вялікае вам дзякуй, дарагія беларускія сябры. Прыязджайце у наступным годзе. Будзем чакаць. Перадавайце прывітанне усім камсамольцам, усёй моладзі вашага універсітэта!» — сказау на развітанне дырэктар саугаса «Алгабаскі» Серык Джумубаевіч Рашэу.**

**Ул. СІЛІН,**
**камандзір СБА «Вікторыя», студэнт III курса гістфака.**

## АПЕРАДЖАЮЧЫ ВОСЕНЬ

Доугія барозны недзе там, далёка, нібы сходзяцца у адну нябачную кропку. Адны з іх некранутыя, па іншых, выкідаючы наверх белыя клубні, прайшла бульбакапалка. Няроунай шарэнгай — хто крыху уперадзе, хто адстаючы—рухаюцца зборшчыцы-студэнткі факультэта журналістыкі. «Бульбакапалкамі» жартауліва называюць іх у калгасе «Перамога» Дзяржынскага раёна.

А хлопцы — тыя заняты іншай справай, «больш інтэлігентнай», як гавораць яны. Хто на перавозцы кармоу, хто на таку. Сяргей Шахновіч і Аляксандр Сачанка адвозяць бульбу. Праца адказная і нялёгкая. А на полі яны не дазваляюць дзяучатам адносіць да скрыні поуныя вёдры. Стараюцца гэта зрабіць самі. Самі ж яны і разгружаюць бульбу ля бурта. Такое раздзяленне працы дае магчымасць збіраць па 1100—1200 кг бульбы на кожнага чалавека замест 720 па норме. А былі ж і такія дні, калі кожны са студэнтау збірау па 1560 кг!

Юнакі і дзяучаты спяшаюцца: хутка могуць прыйсці маразы. Кароткі асенні дзень не чакае.

**В. ФЕРАНЦ,**
**студэнт.**

## ПЛЁННАЯ САДРУЖНАСЦЬ

Сяброускія адносіны усталяваліся паміж нашым універсітэтам і вышэйшымі педагагічнымі установамі Польшчы. Частымі і жаданымі гасцямі Кракаускай вышэйшай педагагічнай школы і Варшаускага універсітэта бываюць студэнты-філолагі БДУ. У сваю чаргу польскія студэнты, якія вывучаюць рускую і беларускую мовы, з вялікай карысцю слухаюць нашых выкладчыкау, знаходзяць адказы на цікавячыя пытанні, раяцца, як лепш напісаць дыпломную ці курсавую работу, знаёмяцца з жыццём беларускага народа.

Сёлета будучыя выкладчыкі рускай і беларускай моу — студэнты пятага курса філалагічнага факультэта Варшаускага універсітэта—сваю пераддыпломную практыку праходзілі у Мінску. Тры тыдні для іх чыталі лекцыі, праводзілі з імі семінарскія заняткі, кансультацыі вопытныя выкладчыкі БДУ. Разам з нашымі студэнтамі пасланцы Польшчы наведалі выстаукі, музеі, тэатры Мінска, азнаёміліся з яго выдатнымі мясцінамі. Перад ад'ездам я звярнууся да польскіх сяброу з пытаннем: «З якім пачуццём і настроем вы ад'язджаеце дадому, ці была карыснай практыка?». І вось што яны адказалі.

**Аля Дабасевіч:**

— Я не знаходжу слоу, каб выказаць сваю падзяку выкладчыкам Беларускага дзяржаунага універсітэта. Нам глыбока запалі у памяць іх лекцыі, семінарскія заняткі, шчырыя гутаркі і парады. Вельмі каштоўнымі былі для нас семінарскія заняткі па лексікалогіі рускай мовы, якія праводзіла дацэнт Людміла Аляксандрауна Шаучэнка. На яскравых прыкладах мы пераканаліся у невычарпальным багацці выяуленчых сродкау і гібкасці рускай мовы, засвоілі яе сучасныя літаратурныя нормы вымаулення. Не забудзем мы і вельмі уважлівага і шчырага выкладчыка рускай літаратуры дацэнта Ілью Цімафеевіча Іщчанку. Па тэмах дыпломных работ ён даў карысныя парады, унёс слушныя прапановы, дапамог падабраць неабходную літаратуру, скласці бібліяграфію.

**Галіна Кухарчык:**

— Вельмі важна і тое, што мы мелі магчымасць блізка пазнаёміцца з культурай Савецкай Беларусі, гаварыць з людзьмі розных прафесій і узростау, назіраць, як на справе ажыццяуляюцца велізарныя планы камуністычнага будауніцтва. Мы былі на ВДНГ БССР, наведалі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Дзяржауны мастацкі музей БССР, музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку.

Багатыя уражанні пакінуу тэатр імя Янкі Купалы, які сёлета адзначае свой 50-гадовы юбілей. Там мы глядзелі «Паулінку» Я. Купалы і «Лявоніху на арбіце» А. Макаёнка. Апошні пры сустрэчы у антракце падарыу нам аутограф.

Назаусёды застанецца у памяці і паездка у Хатынь. Жалобны набат званоу нагадвае аб нечалавечых пакутах і жахах II сусветнай вайны, абуджае пякучы гнеу і нянавісць да фашысцкіх варварау.

Я жадаю, каб над усёй планетай свяціла мірнае сонца, спакойна займаліся стваральнай працай людзі, шчасліва раслі і вучыліся іх дзеці.

**Анна Багіньска:**

— Развітанне заусёды наводзіць смутак. Мы моцна пасябравалі са студэнтамі Беларускага універсітэта, пранікліся узаемнай павагай і сімпатыяй. Мы вязем з сабой найлепшыя успаміны аб дэкане філалагічнага факультэта Аляксею Арсенцьевічу Волку, кірауніку нашай групы кандыдату філалагічных навук Віктару Пятровічу Краснею і многіх іншых выкладчыках і студэнтах.

Работнікі камітэта камсамола пазнаёмілі нас з гісторыяй Беларускага універсітэта. які рыхтуецца адзначыць сваё 50-годдзе, расказалі, чым жыве, захапляецца, што робіць шматтысячны калектыу студэнтау-камсамольцау.

Ад усёй душы мне хочацца падзякаваць за усё добрае, што зрабілі тут для нас, і на развітанне сказаць: прыязджайце да нас у госці.

**Л. ПЕТЭРСОН.**

## СУСТРЭЧА З МАРАЙ

Яшчэ у школе Федзя Пратасеня напісау сваю першую заметку у газету. З той пары ён — актыуны юнкор раённай і рэспубліканскіх маладзёжных газет.

Але юнаку, перш чым стаць прафесіянальным газетчыкам, захацелася выпрабаваць сябе у жыцці. І, відаць, з гэтай мэтай пасля школы пайшоў вучыцца у медыцынскае вучылішча. Але і тады ён часта брау у рукі аловак і блакнот, сістэматычна дасылаў свае карэспандэнцыі у слонімскую раённую газету «За перамогу камунізма».

Пасля вучобы Ф. Пратасеня працуе загадчыкам медпункта на Палессі, але не парывае сувязі з газетай. Тут ён піша нарыс пра урача, які апублікавала газета «Шахцёр». За удала раскрыты вобраз, цікавы сюжэт аутар атрымлівае першую прэмію ў конкурсе на лепшы твор пра сучасніка.

А калі Фёдар папрасіу характарыстыку-рэкамендацыю, рэдактар салігорскай газеты Ф. Скрыган моцна паціснуу юнаку руку:

— Шчаслівай дарогі!

Так Фёдар Пратасеня сустрэуся са сваёй марай. Ужо тут, ва універсітэце. Цяпер ён—студэнт першага курса факультэта журналістыкі. Думаецца, што Фёдару заусёды будзе спадарожнічаць творчы поспех.

**М. ПРАКВІДА,**
**студэнт.**





*У БДУ працуюць 8 агульнауніверсітэцкіх калектывау мастацкай самадзейнасці: народная харавая капэла, народны аркестр народных інструментау, народны ансамбль танца «Крыжачок», студэнцкі тэатр, эстрадны ансамбль, духавы аркестр, цымбальная і вакальная групы. Акрамя гэтага, пры студэнцкім клубе працуюць на 9 факультэтах 12 канцэртных брыгад У гэтых калектывах налічваецца 602 студэнты-камсамольцы.*

*НА ЗДЫМКУ: (уверсе) народная харавая капэла; (злева) народны ансамбль танца «Крыжачок».*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

## НАРАЧ — СПОРТ І АДПАЧЫНАК

**Хто хоць раз пабывау на возеры Нарач, той ніколі не забудзе гэты цудоуны куток беларускай прыроды. Сюды ў спартыўна-аздараўленчы лагер універсітэта у летні час прыязджае многа студэнтаў і супрацоўнікаў, каб адпачыць, загарэць, набрацца сіл. Прыязджаюць сюды і члены зборных каманд універсітэта па розных відах спорту. Яны ж і з'яўляюцца асноўнымі арганізатарамі і ўдзельнікамі ўсіх спартыўных спаборніцтваў і мерапрыемстваў у лагеры. Гэта яны сваім энтузіязмам і прыкладам ствараюць цікавейшую атмасферу спартыўнай актыўнасці, прыцягваюць да рэгулярных заняткаў тых студэнтаў, якія раней былі толькі балельшчыкамі.**

**Усе спаборніцтвы ў лагеры праводзіліся па праграме спартакіяды. У першай змене—па 10 відах спорту і па шасці — у другой.**

**Асабліва ажыўлена і цікава праходзілі спаборніцтвы па валейболу, футболу, грэблі, кросу. Тут не было раўнадушных назіральнікаў. Адны студэнты былі актыўнымі ўдзельнікамі спаборніцтваў, іншыя — балельшчыкамі, актыўна падтрымлівалі свае каманды.**

**Вялікай падзеяй аказаліся таварыскія сустрэчы каманд БДУ па валейболу, футболу, настольнаму тэнісу з камандамі дзіцячай спартыўнай школы г. Мінска і прадстаўнікамі лагера інстытута замежных моу.**

**Выдатна зарэкамендавалі сябе ў гэты час нашы інструктары-актывісты. Яны арганізавалі свае атрадныя каманды, праводзілі трэніроўкі і спаборніцтвы. Добрыя арганізатарскія здольнасці праявілі Аркадзь Каравай, Валя Міхнова, Таня Пшыркова, Лёня Пушкін, Валя Цагойка, Тома Цімашкова і іншыя.**

**Разам з тым, прысутнічала у лагеры і група студэнтау, якія не праявілі сябе ні ў адной карыснай справе, былі пасіўнымі ў правядзенні розных мерапрыемстваў, нярэдка парушалі дысцыпліну. Прафкому універсітэта неабходна больш строга адносіцца да падбору студэнтаў, якія накіроўваюцца ў лагер.**

**М. КУЧЫНСКІ,**
**выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 1168. АТ 21810